© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№10 (300) 6 — 13 сакавіка 2003г. Наклад 12.300 экз. Кошт 350 руб.

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ
Слонім,
Зэльва,
Дзятлава,
Масты,
Ваўкавыск,
Шчучын,
Ліда,
Гродна,
Баранавічы,
іншыя гарады Беларусі,
а таксама на HTTP://gs.promedia.by

АНОНС

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ

в г. Слониме по состоянию на 9.15 04.03.2003г.

"Беларусбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	1950	1975
1 EURO	2100	2160
1 ZL	505	520
1 RUR	59	62,8

оао "Белпромстройбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	1950	1975
1 EURO	2100	2160
1 ZL	505	520
1 RUR	59	62,8

"Белагропромбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	1940	1980
1 EURO	2090	2160
1 ZL	500	530
1 UAH	340	380
1 RUR	59	62,7

Нацбанк РБ	
1 USD	1976
1 EURO	2134,48
1 RUR	62,54

Віншуем са святам вас, дарагія!

Нашы каханыя жанчыны,
Вясной, ці ў кожны іншы час
Ў жыцці мужчын няма хвіліны,
Калі б не думалі пра вас.

Фота Віталя ГІЛЯ

ВЫБОРЫ-2003

В ОСНОВНОМ ВЫБРАЛИ

Подведены предварительные итоги явки избирателей на местные выборы, которые прошли в Беларуси 2 марта.

По информации Слонимской районной избирательной комиссии 34 кандидата стали депутатами местных Советов и 4 — областного Совета депутатов. Не прошёл в депутаты местного Совета бывший директор Слонимского мясокомбината Олег Бердула. По предварительным подсчётам голосов, за него проголосовали всего порядка 30 процентов избирателей. Следует отметить, что альтернативные выборы на Слонимщине прошли только в двух избирательных округах. Так по 14-ому избирательному округу победу в выборах одержал директор Слонимского картонно-бумажного завода Пётр Салита, за которого (по предварительным данным) проголосовали 73 процента избирателей. Его соперник, председатель общественного молодёжного объединения «Ветразь» Алесь Масюк набрал 24,4 процента голосов избирателей.

По 18-ому избирательному округу в депутаты баллотировались врач местного ТМО Иван Шего и начальник ЖЭС-1 Сергей Барабутько. За Ивана Шего свои голоса отдали 66,4 процента избирателей, а за Сергея Барабутько — только 16,7 процента избирателей. Победа более, чем убедительная.

Как сообщает информационное агенство БелаПАН, в результате прошедших выборов в Гродненский городской Совет депутатов избрана лишь половина от необходимого количества депутатов.

По 30 городским округам избрано 15 депутатов, из них 13 — безальтернативно. На шести оставшихся округах пройдет второй тур, еще на девяти — повторные выборы.

Все прошедшие в Гродненский горсовет депутаты — так называемые представители власти. Среди них — главврачи больниц, глава районной администрации, директоры молкомбината, универмага, автобусного парка, ректор университета.

(Продолжение на 2 стр.)

Лиц № 30 от 30.11.99г. до 30.11.04г., СПИК
ТЕХНИКА для ДОМА И ОФИСА
ФОРМА ОПЛАТЫ - наличный, б/наличный расчёт, чековая книжка.
Каждой покупательнице к празднику 8 Марта — скидки!
2-15-30
г. Слоним, ул Советская,8

Лиц № 30 от 30.11.99г. до 30.11.04г., СПИК
Магазин
г. Слоним, ул. Первомайская, д.3.
ФОРМА ОПЛАТЫ - наличный, б/наличный расчёт, чековая книжка.
ДЛЯ СТРОЙКИ Всё И РЕМОНТА
2-30-00

Дорогие женщины!
Поздравляем Вас с праздником!
Пусть Бог даст вам силы спокойно принимать всё, что принесёт день, будьте терпеливы, умейте любить, прощать. Желаем вам всегда быть счастливыми, весёлыми, мудрыми... Пусть радость никогда не покинет ваши сердца, а невзгоды не омрачают ваши хрупкие души!
Коллектив ИП Лазаря

ПОЕЗДКИ ЕЖЕДНЕВНО
Гродно Минск
Слоним
тел. 44-2-88
8-0296-20-32-70
Лиц. №5-0196, 25.02.98-25.02.03. МТК РБ

Организовываем поездки на а/м "Форд-Транзит" в ГРОДНО
Доставка в любой район города
15 мест.
Принимаем заявки по перевозке пассажиров по РБ.
Запись по тел.:
~~2-14-90~~, 2-92-18, 8-0296-78-09-72.
Лиц. № 5-0474, 15.07.02г.-14.07.04г. МТК РБ

РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА

Коллектив магазина «Гаспадар» поздравляет всех женщин с праздником 8 Марта!
Желаем вам светлого и прекрасного праздника, море цветов и улыбок. Никогда не теряйте желания нравиться, быть интересными и привлекательными, и пусть у вас на это всегда хватает времени!
Будьте счастливыми, весёлыми и добрыми!

Автобусом в БЕЛОСТОК за покупками.
С посещением вещевого рынка, оптовых магазинов, супермаркета.
Еженедельно, по четвергам.
Тел. 2-44-66, 8-02962-5-21-06.
Лиц. АК№5-0327 от 14.03.2002г. МТК РБ

Осуществляем поездки в г. Гродно
автобусом "Форд-Транзит" (15 мест).
Принимаем заказы на обслуживание коллективных мероприятий.
Запись по тел. 5-24-45
8-029-630-76-60
Лиц. № 5-0482, 02.08.02г.-01.08.07г. МТК РБ

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ВЫБОРЫ-2003

В ОСНОВНОМ ВЫБРАЛИ



Во время голосования на Черняховском участке №7

(Продолжение. Начало на 1 стр.)

Во второй тур прошли три представителя оппозиции: член Партии БНФ, председатель организации Белорусского независимого профсоюза АО "Гродно Азот" Сергей Антусевич, лидер гродненской городской организации Объединенной гражданской партии (ОГП) Юрий Истомин и руководитель областного отделения Белорусского Хельсинкского комитета Александр Антонюк.

Проиграли выборы два кандидата от Партии БНФ и один – от ОГП.

По предварительным данным, участие в выборах депутатов местных Советов приняли 5 миллионов 202 тысячи избирателей или 73,3 процента граждан Беларуси, включенных в списки для голосования.

По данным Центральной комиссии Республики Беларусь по выборам и проведению республиканских референдумов, местные выборы обошлись белорусской казне в 7 миллиардов рублей при запланированных 10 миллиардах. Сэкономленные средства будут возвращены в республиканский бюджет.

Окончательные итоги первого тура местных выборов ЦИК подведет на своем заседании 6 марта.

Микола КОНОНОВИЧ

ФЕМІДА

ДЫРЭКТАРА НЕ ПАСАДЗІЛІ

Трэцяга сакавіка слонімскі суд вынес прыгавор па крымінальнай справе ў дачыненні былога дырэктара Слонімскай камвольна-прадзільнай фабрыкі Віктара Галіча.

Нагадаем, што крымінальная справа супраць Віктара Галіча была ўзбуджана восенню мінулага года Упраўленнем дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю РБ па Гродзенскай вобласці.

Былы дырэктар быў прызнаны вінаватым у выкарыстанні службовых паўнамоцтваў і ўчыненне адказнай асобай дзеянняў, якія мелі цяжкія наступствы для прадпрыемства. На аснове часткі 3



артыкула 424 Крымінальнага кодэкса РБ і з прымяненнем артыкула 70 Крымінальнага кодэкса суд прызначыў Віктару Галічу два гады папраўчых работ па месцу працы з утрыманнем 20% заробку на карысць дзяржавы. Па шэрагу артыкулаў крымінальнага кодэкса Віктар Галіч быў апраўданы.

Суд вызваліў ад арышту крэдытарскую запазычанасць Слонімскай КПФ перад фізічнымі асобамі нерэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, які быў накладзены 18.09. 2002 года следчым фінансавай міліцыі.

Таксама суд прызнаў за ісцом, акцыянерным таварыствам Слонімская КПФ, права на задавальненне грамадзянскага іску ў дачыненні былога дырэктара і перадачы пытання аб устанаўленні памераў іску на разгляд у парадку грамадзянскай судовай вытворчасці. У крымінальнай справе Віктара Галіча называлася сума стратаў КПФ у памеры 414 мільёнаў 539 тысяч 507 рублёў.

На пытанне карэспандэнта "ГС", ці збіраецца ён абскарджваць рашэнне Слонімскага райсуда, Віктар Галіч адказаў, што не бачыць у гэтым ніякага сэнсу.

Мікола КАНАНОВІЧ

МНЕНИЕ


НЕ ВАШЕ ЭТО ДЕЛО

До сих пор не могу понять предназначения Слонимской районной инспекции по охране окружающей среды. В моем представлении люди, которые причисляют себя к этой организации, практически ничего полезного не сделали для того, чтобы хоть как-то улучшить экологическую ситуацию в нашем городе.

Штрафы за мойку автомобилей возле водоемов, плановые публикации о редких видах птиц в местной газете, – по-моему, этого слишком мало для инспекции, которая должна охранять нашу природу.

Не так давно смотрела фильм про "Greenpeace". Несколько отважных членов этой организации в маленькой моторной лодке кружили перед огромным китобойным судном, тем самым, препятствуя отлову китов. На что только не идут люди, преданные своему делу!

Явно видно, что экологическая ситуация в Слониме ухудшается с каждым годом. Неднакратно корреспонденты "ГС" по просьбе жителей Волгоградской улицы обращали внимание местной инспекции по охране окружающей среды на то, что Слонимский льнозавод незаконно сжигает льнокостру, тем самым загрязняя воздух. "Мы обязательно разберемся с этой проблемой", – неоднократно говорили в инспекции. Однако так ничего и не сделали.



Спиленные в Альбертине деревья

А совсем недавно в городской парк коммунальные службы вывезли грязный снег с солью, собранный с дорог почти по всему городу. С наступлением весны вся эта грязь польется в Щару. Да и трава, деревья вряд ли будут там расти. Соль сделает своё дело. И куда только смотрят местные "гринписовцы"? С таким вопросом обратились в редакцию местные жители, которым не безразлично состояние экологии.

По словам начальника инспекции Николая Дегтярева, про эту проблему он знает. "А вообще-то у нас есть своя газета, с которой мы общаемся, – сказал Николай Михайлович, – и я не обязан с вами разговаривать". Вот такой "исчерпывающий" ответ я получила, задав вопрос о том, не беспокоит ли инспекцию то, что грязный снег завезли в парк. Знать о проблеме – одно, а стараться как-то ее решить – другое дело.

По Слониму начали пилить деревья. Например, в районе Альбертина на прошлой неделе сотрудники лесничества спилили несколько красивых корабельных сосен. В "ГС" позвонили жители близлежащих домов, чтобы рассказать об этом безобразии. "Так красиво было! И в один миг разрушили красоту!" – жаловались слонимчане. Опять-таки: где же разрешение от местной инспекции по охране окружающей среды на спиливание деревьев? А нет его.

Директор альбертинского лесничества Иван Кайбаш сослался на то, что, мол, "сверху" поступило указание улучшить эстетический вид города, спилив парочку "мешающих" деревьев.

Местная инспекция по охране окружающей среды опять-таки молчит, "огрызаясь" лишь с журналистами: не ваше, мол, дело...

Да уж, не наше это дело, что в 25-ти метрах от Лобазовского озера строят заправочную станцию (как убеждены в инспекции, ничего в этом страшного нет: там будут построены очистные сооружения...), не наше дело, что практически заросло и высохло старое русло Щары, что летом купаться негде из-за грязной воды...

Так и получается, что где живем, там и гадим.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ПРОШУ СЛОВА

А ПЕНСИОНЕРЫ ОБНИЩАЛИ

Хочу поделиться своими впечатлениями о прошедших выборах.

Живу я в деревне Гловсевичи Слонимского района. Я пенсионер и, так скажем, родился в прошлом веке. Такого бардака, какой творится сейчас, раньше не было. Для участия в выборах назначили каких-то кандидатов в депутаты, которых мы, простые жители, и в глаза не видели. Только фотографии на стенах расклеили. А вот сами кандидаты даже и не удосужились собрать своих избирателей и хотя бы познакомиться. Так за кого голосовать?

Вокруг безобразие: ни нормальной пенсии, ни зарплаты. Что толку с того, что мне дают гроши, которые потом государство забирает на оплату коммунальных услуг? Обнищали пенсионеры. А в стране все проводят и проводят выборы. На днях по телевизору слышал, что на эти цели выделили около 10 миллиардов рублей. Лучше бы эти деньги пустили на выплату пенсий, зарплат. Все у нас делается не на благо народа, а наоборот.

И еще: у нас в Гловсевичах ликвидировали избирательный участок. Поэтому для голосования нужно было ехать в Деревянчицы. Накануне выборов вывесили объявление, что второго марта в 9.00 автобус повезет всех голосующих в Деревянчицы. В воскресенье молодежь и пенсионеры, которые еще немного чем-то интересуются, собрались возле магазина. А автобус приехал намного позже. Одним словом – бардак.

Иван Петрович, житель деревни Гловсевичи

КОМІКС



ДАСЬЕ

Мастак-мультыплікатар Андрэй Сідараў нарадзіўся ў Слоніме. Скончыў СШ №7 і Мінскае мастацкае вучылішча імя Глебава. У свой час ён працаваў у Беларускім анімацыйным цэнтры, цяпер – вольны мастак. Жыве з сям'ёй у Слоніме.



© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

З ЗАЛЫ СУДА

МОЛАДЗЬ У СУДОВЫХ СПРАВАХ

■ Мікола КАНАНОВІЧ

І ПАГНАЛІ ВЯСКОЎЦЫ ГАРАДСКІХ


Восенню мінулага года мінчане Віталь Дробыш з сяброўкай і Андрэй Гаравы з жонкай прыехалі ў вёску Драпава Слонімскага раёна ў госці да бабулі. Вечарам 9 лістапада маладыя людзі адправіліся на дыскатэку ў вясковы клуб. Там іх чакалі зусім не вясёлыя прыгоды.

У той вечар 18-гадовы мясцовы жыхар Сяргей Чарнацкі, як звычайна, прыйшоў на дыскатэку. Каля клуба сустрэў знаёмую, у якой быў дзень нараджэння. Дзяўчына прапанавала выпіць за яе здароўе. Выпілі проста за клубам. А калі вярнуліся да парадната ўваходу, то Чарнацкі убачыў, што на вуліцы стаяць і паляць цыгарэты двое незнаёмых яму хлопцаў з дзвюма дзяўчынамі. Сяргей падышоў да аднаго з іх (як пазней аказалася, да Віталя Дробыша) і спытаў цыгарэту. Мінчук пачаставаў абарыгена, і той адышоў у бок сваёй кампаніі, якая, тым часам, паціху сабіралася ў двары клуба. Потым зноў падышоў і... нанёс Дробышу ўдар. Аднак справацыравацъ такім чынам бойку яму адразу не ўдалося. Адчуўшы нядобрае, мінскія госці вырашылі пакінуць дыскатэку. Калі яны адышліся на некалькі метраў ад клуба, іх дагнаў Чарнацкі з кампаніяй. У п'янага Чарнацкага, як ён сам тлумачыў у судзе, было на мэце высветліць адносіны з Дробышам. Маўляў, чаго той паказваў на яго пальцам, пасля таго, як пачаставаў цыгарэтай. Ды і цыгарэта аказалася хоць і з фільтрам, але не таго, як хацеў (збалаваны дарагім курывам!) вясковы юнак, гатунку. Ну а "група падтрымкі" сама пабегла за пакрыўджаным хлопцам, ён іх за сабой не клікаў. Ва ўсякім разе такія паказанні даваў Чарнацкі ў судзе. Высвятленне адносін пачалося з таго, што Чарнацкі з разбегу штурхнуў Дробыша і абое аказаліся на зямлі. Прычым, атлетычнага складу Віталь Дробыш накрыў сабой мясцовага каўбоя, вага якога, на выгляд, не павінна перавышаць і 60 кг. Астатнія абарыгены падключыліся да справы і пачалі збіваць Дробыша рукамі і нагамі. У цемры цяжка было вызначыць, колькі чалавек прымала ўдзел у збіцці. На судзе Дробыш называў лічбу ў 12 чалавек, яго сябар Андрэй Гаравы схільны лічыць, што іх было каля 10. Сам Чарнацкі таксама дакладную лічбу не назваў. Але той факт, што вясковы задзіра не пабаяўся накінуцца на ўдвая за сябе здаравейшага хлопца, сведчыць пра надзейны тыл Чарнацкага. Але і на гэты раз мінчукі паспрабавалі сысці ад працягу канфлікта. Гаравы крычаў, каб перасталі біць Дробыша, адцягваў і супакойваў вясковых хлопцаў. Калі Дробыш з Чарнацкім падняліся з зямлі, мінчукі накіраваліся ў бок сваёй машыны, а мясцовыя на нейкі час прытрымалі Чарнацкага, які прагнуў працягу "банкета" і рваўся ў бой. Прытрымлівалі, відаць, слаба, бо не паспелі мінчукі дайсці да аўтамабіля, каб хутка пакінуць зусім не гасцінную кампанію вяскоўцаў, як тыя зноў іх дагналі.

"Нехта спіхнуў мяне ў кювет. Я падвярнуў нагу і падняцца не змог. Мяне зноў пачалі збіваць. Я страціў прытомнасць. Ці быў пры гэтым Чарнацкі, дакладна не ведаю, толькі са словаў Андрэя Гаравога...," — расказваў на судовым пасяджэнні пацярпелы Дробыш. Гаравы, які зноў прыкладваў усе свае мірныя намаганні, каб спыніць збіццё сябра, прысутнасць у гэтым эпізодзе Чарнацкага пацвердзіў. Гаравы за сваю міратворчасць таксама атрымаў некалькі нязначных удараў. Але галоўнай мішэнню быў Дробыш.

З кювета Віталя Дробыша выносілі Андрэй Гаравы з дзяўчатамі і дапамагаў нехта з мясцовых. Дасталося яму на гэты раз не слаба. Кампанія ж вясковых хуліганаў рассеялася ў вечаровай цемры позняй восені. І галоўнае, мінчукі не ведалі нікога з вясковых хлопцаў, хто іх так "дабрадушна" сустрэў каля Драпаўскага клуба. Акрамя аднаго, які назаўтра і здаў прозвішча "правакатара" Сяргея Чарнацкага па мянушцы Дзікі. Так следства і закруцілася вакол Чарнацкага. Магчыма, справа да суда і не дайшла б, але Чарнацкі менш як праз два месяцы вызначыўся зноў — пасля навагодняга вечара 29 снежня каля мясцовай школы збіў свайго земляка Шчыкаціхіна, які быў сведкам бойкі і, на думку Чарнацкага, даваў не тыя паказанні.

Таму на судзе ён праходзіў па двух эпізодах і атрымаў паўтары гады абмежавання волі ці, іншаму — "хіміі". Такім чынам перад законам Чарнацкі адзін панёс пакаранне за ўсю кампанію. Не здаў таварышаў.



Фота IREX/ProMedia

Моладзь тусуецца

...Сяргей падышоў да Віталя Дробыша і спытаў цыгарэту. Мінчук пачаставаў абарыгена, і той адышоў у бок сваёй кампаніі, якая, тым часам, паціху сабіралася ў двары клуба. Потым зноў падышоў і... нанёс Дробышу ўдар.

...Яны збілі чалавека, а потым разбулі і раздзелі. Здабычай рабаўнікоў сталі куртка коштам 100 тысяч рублёў, чаравікі за 30 тысяч, шапка за 4 тысячы, цыгарэты, запалкі, грабеньчык і нават жвачка.

ЗБІЛІ І АБАБРАЛІ, ЯК ЛІПКУ

А вось у горадзе, звычайна, б'юць не таму, што фізіяномія не спадабалася альбо родам не адсюль. Тут на першым месцы выступае карысць.

Так раней судзімы Дзмітрый Дудзін са сваім сябрам Андрэем Сцепанюком сёлета сёмага студзеня каля дома №7, што на вуліцы Даватара ў Слоніме, прыкладна, каля 23 гадзін накінуліся на сланімчаніна Пятра Якімовіча. Яны збілі чалавека, а потым разбулі і раздзелі. Здабычай рабаўнікоў сталі куртка коштам 100 тысяч рублёў, чаравікі за 30 тысяч, шапка за 4 тысячы, цыгарэты, запалкі, грабеньчык і нават жвачка. Пажывіліся рабаўнікі на агульную суму 140 тысяч рублёў. Акрамя таго, яны на нейкі час адабралі ў чалавека здароўе. З месца злачынства рабаўнікі ўцяклі. Аднак злачынства было раскрыта. І паказальным у гэтай справе з'яўляецца той факт, што сведкамі па ёй праходзяць непаўналетнія Дзмітрый Дамброўскі, Алена Зацэнка, Дзмітрый Багдановіч і Вадзім Марчык, кожнаму з якіх няма яшчэ і 14 гадоў. Гэтыя сведкі таксама прыклалі руку ці нагу да пацярпелага Якімовіча, якому не пашчасціла трапіць на вочы вулічнай кампаніі.

І пакуль Дзмітрый Дудзін, асуджаны на 11 гадоў і 3 месяцы калоніі асобага рэжыму і Андрэй Сцепанюк, які атрымаў 6 год калоніі строгага рэжыму (абое — з канфіскацыяй маёмасці) нясуць пакаранне, у горадзе ім падрастае вартая змена. ■

ЗДАРЭННІ

ПАКУЛЬ ПАДКРУЧВАЎ ГАЙКІ — УКРАЛІ МАБІЛЬНІК

Вадзіцель польскай "фуры" спыніўся на абочыне дарогі каля вёскі Новая Стража, каб падкруціць гайкі на колах аўтапоезда.

Пакуль паляк абыходзіў з гаечным ключом свой аўтамабіль, нехта незаўважна прапнік у кабіну машыны і забраў сотавы тэлефон.

Праводзіцца праверка.

"ПАЗЫЧЫЛІ" СТАНОК

У сланімчаніна Ж., які жыве ў Рышчыцах, няпрошаныя госці ўкралі з хлява дрэваапрацоўчы станок.

Аднак пакарыстацца чужой маёмасцю злодзеі не паспелі — іх хутка затрымалі работнікі міліцыі.

Станок зноў вярнуўся да гаспадара, а рабаўнікі адкажуць па закону.

Мікола КАНАНОВІЧ

ГОРЕЛИ ДВА ДОМА...

На прошлой неделе по ул. Шоссейной в Слониме загорелся жилой дом.

Огнем повреждены стены, потолок, а также имущество.

А в ночь на 3 марта, в понедельник, горел дом по ул. Октябрьской. В результате пожара повреждён потолок, перекрытия постройки.

... И КВАРТИРА

А в понедельник, 3 марта, по улице Ершова в многоэтажном доме горела квартира.

Огнем повреждено имущество, которое находилось в квартире.

Причины пожаров, а также суммы нанесенных ущербов устанавливаются.

ВСПЫХНУЛ "ФОРД-ТРАНЗИТ"

На улице Красноармейской в понедельник, 3 марта, загорелся бус "Форд-Транзит".


Огнем поврежден моторный отсек автомобиля, а также водительский салон.

Причина пожара устанавливается.

Ольга ШИНКЕВИЧ

огромный выбор
магазин Мастер
СВЕТИЛЬНИКИ
ДВЕРИ металлические, из дерева
ОКНА
оконная и дверная ФУРНИТУРА
СМЕСИТЕЛИ для кухни, ванны
качество высокое
цены доступные
наличный и безналичный расчет
УЛ. КУПАЛЫ,5
Т. 4-63-89; 8-0296-589179







© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

СВЯТА

БЫВАЙ, ЗІМА!


Калядоўшчыкі выганяюць зіму


Удар, яшчэ ўдар!

У мінулую суботу ў гарадскім парку жыхары Слоніма і раёна праводзілі зіму.

Праводзіны адбываліся з танцамі, песнямі, півам і шашлыкамі. Цяпер, наогул, людзей нічым асаблівым не здзівіш. Але, калі хто трошкі быў на падпітку, дык весяліліся ад душы: і ў конкурсах прымалі ўдзел, і танцавалі, і песні спявалі. Хаця на праводзінах зімы моцных спіртных напояў не прадавалася, жадаючыя бегалі ў суседнія з паркам магазіны. А вось піва і шашлыкоў хапала.

Найбольш шматлюдна было каля танцавальнай пляцоўкі, дзе мясцовыя артысты давалі канцэрт. А побач вучні школ гандлявалі сваімі таннымі, але арыгінальнымі вырабамі.

Весела было і каля высокага слупа, на самым версе якога віднелася прывязаная бутэлька шампанскага. Знаходзіліся смельчакі, якія дабіраліся да самага верху і здымалі шампанскае. Праўда, адзін раз бутэлька сарвалася зверху і стукнула аднаго са смельчакоў. Але ўсё абышлося добра.

Цікавым быў і яшчэ адзін конкурс. На перакладзіне хлопцы збівалі адзін аднаго мяшкамі. Хто саб'е двух чалавек, як, напрыклад, гэта зрабіў Аляксей Сянько, той атрымліваў прыз. Аляксей атрымаў танны адэкалон.

Найбольш раздольна падчас свята было дзецям. Яны каталіся з горкі, на машынках, ласаваліся салодкаю ватаю і напіткамі, а таксама фатаграфаваліся каля снежных домікаў.

Зіму слонімцы правялі сціпла, гэтак сціпла яны сустрэлі і вясну. Ды чаму тут радавацца: разам з вясною да нас прылятае не толькі ластаўка, але ўзрастуць цэны на тавары, праезды і розныя іншыя паслугі.

Сяргей ЧЫГРЫН,
фота Віталя ГІЛЯ


Па бутэльку шампанскага

ВАНДРОЎКА


АД ЖЫРОВІЧАЎ ДА ЯКІМАВІЧАЎ

Беларускі пісьменнік і журналіст Лявон Вашко жыве ў бацькоўскай хаце ў Мастах. Некалі яму ўдалося прыдбаць камп'ютар і аўтамабіль "WV", на якім Лявон сяды-тады ездзіць да сяброў у той ці іншы куток роднай Бацькаўшчыны.

На мінулым тыдні мы з Лявонам завіталі ў прыгожае мястэчка нашай зямлі — Жыровічы. Ніякай мэты перад сабою не ставілі, проста вырашылі адпачыць душою і сэрцам.


Адзіным шчырым беларусам у Жыровіцкім манастыры быў і застаецца інак Мікалай (паэт і філосаф Алег Бембель). Сустрэчы з гэтым цікавым і таленавітым чалавекам заўсёды застаюцца ў памяці. Інак Мікалай увесь у справах. Ён выдае багаслоўска-літаратурна-мастацкі лісток "Жыровіцкая абіцель", пад яго рэдактурай выходзяць іншыя рэлігійныя праваслаўныя выданні, а таксама пішуцца паэтычныя радкі:

Калі ты і плоцьцю,
й душой нездароў,
І боль твой суняцца ня можа —
Успомні, што ёсьць
жыватворны Пакроў
Жыровіцкай Маці Божай.



Веньямін

Мы пахадзілі па тэрыторыі манастыра, пагутарылі з інакам Мікалаем, які на развітанне падараваў нам тры выданні "Жыровіцкай абіцелі". Усе яны заслугоўваюць увагі і асобных гутарак. Адно з іх прысвечана старцам Жыровіцкай абіцелі, другое — асновам сацыяльнай канцэпцыі Рускай праваслаўнай царквы, а трэцяе мае назоў "Суд за гробом". На хаду гартаючы апошнюю кніжку, кінуліся ў вочы радкі з яе: "У адной толькі Белай Русі, за адзін 2001 год, дзяўчатамі, маладзей ад 18 год, забіта ў чэраве каля 81 тысячы немаўлятак...". Лічба ашаламляльная.



Тут жывуць пустэльнікі

Сядаючы ў машыну, Лявон пытаецца: "Ці, ведаеш ты слонімскіх пустэльнікаў? Так хочацца паглядзець, дзе і як яны жывуць. Дарэчы, гэта адзіныя ў Беларусі пустэльнікі. А вось на Украіне іх значна больш".

Таму з Жыровічаў мы накіроўваемся шукаць пустэльнікаў, якія жывуць у лесе за вёскай Якімавічы. Праўда, па дарозе заехалі да слонімскага мастака Яўгена Іванова. Яўген добра ведае мясцовасць каля Якімавічаў, асабліва лес, бо стаптаў яго ўдоўж і ўпоперак у пошукаў грыбоў. Яўген — шчыры хлопец, ён пагаджаецца наведаць пустэльнікаў і, наогул, пабыць нашым гідам у гэтым раёне Слонімшчыны.

За Якімавічамі звярнулі направа ў лясны заснежаны масіў. Да чыгункі неяк даехалі, а далей прыйшлося ісці пешшу. Здалёк пачуўся брэх сабакі. Падыйшоўшы бліжэй, мы ўбачылі каля лясной рачулкі невялікую хатку з прыбудовою. Мясціна для жыцця, сапраўды, выбрана цудоўная. Здавалася: кінуў бы ўсё і на некалькі гадоў схаваўся б тут ад людзей і праблем. Навокал чысціня, цішыня і прастор.

Пачуўшы, што нехта прыйшоў на лясны "панадворак", з хаткі выйшаў чалавек. Пазнаёміліся. Ім аказаўся адзін з пустэльнікаў, спадар Веньямін. Ён распавёў нам пра сваё жыццё, пра тое, як яму жывецца на ўлонні прыроды. "Сюды часта прыязджаюць журналісты з газет, часопісаў і тэлебачання. Нават з ОРТ былі. Але вось ніхто з іх не даў мне ганарару",— абураўся пустэльнік Веньямін. Зразумеўшы, куды ён хіліць, мы далі яму некалькі тысяч рублёў, а пасля, пакінуўшы харчы, развіталіся.

Па дарозе ў Слонім, Яўген Іваноў прапанаваў паглядзець расколаты камень — геалагічны помнік прыроды рэспубліканскага значэння. Ён знаходзіцца кіламетры паўтары на паўднёвым захадзе ад Якімавіч. Дзве дробназярністага шэрага граніту камлыгі ўражваюць.

Адна з іх мае вышыню 3,8 метры, другая — 2,1 метр. Як падае Беларуская энцыклапедыя, расколаты камень трапіў на Слонімшчыну каля 220-150 тысяч гадоў назад са Скандынавіі адзіным блокам, які пры раставанні лёду раскалоўся. Агульная вага каменя — 86 тон.

Завяршылі мы сваю вандроўку ў Альбярціне каля палаца Пуслоўскага. Наогул, Пуслоўскіх было шмат. Але найбольш вядомымі засталіся ў нашай гісторыі Войцех і Цітус Пуслоўскія, якія змагаліся за незалежнасць роднай Бацькаўшчыны. Вось толькі памяць пра іх да сённяшніх дзён у Слоніме не ўвекавечана. Дзякаваць Богу, што хоць уцалелі ў Альбярціне іх палац і канюшня.

Сяргей ЧЫГРЫН

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

НОВОСТИ

МЕДИЦИНСКИЕ УЧИЛИЩА ЛИКВИДИРУЮТ

Согласно решению коллегии Министерства здравоохранения Беларуси, будут ликвидированы несколько медицинских училищ — в Барановичах, Слониме, Полоцке и Молодечно.

Таким образом Минздрав, начиная с 2003/2004 учебного года, планирует сократить государственный план приема студентов для ряда медучилищ, а в некоторых средних медицинских учреждениях образования и вовсе отменить госзаказ.

ХАРТИЯ-97

МАСТЫ

СТАЎ НЕПАТРЭБНЫ

Звольнены з пасады намесніка рэдактара газеты "Зара над Нёманам" складальнік кнігі "Памяць. Мастоўскі раён" Аляксей Сабасцян.

Падставай для звальнення стала скарачэнне пасады намесніка рэдактара. Прычым, заснавальнік газеты, раённы выканаўчы камітэт, зрабіў гэта без папярэдняга ўведамлення. Гэта ўжо чацвёртая спроба пазбавіць Сабасцяна працы. Апошняя была год назад. Тады таксама была зліквідавана пасада намесніка рэдактара, але паколькі кніга "Памяць" была яшчэ не выдадзена, загад быў адменены.

ЗРАБІЛІ "ЗУБРАМ"

За дзень да правядзення галасавання ў паштовыя скрыні выбаршчыкаў Цэнтральнай выбарчай акругі Мастоў невядомыя закінулі агітацыйныя матэрыялы супраць дваццацігадовага кандыдата ў дэпутаты райсавета Алеся Зарэмбюка.

У якасці першапачатковага матэрыялу была скарыстана яго праграма, але паверх яе з дапамогай кампутара былі нанесены надпісы, дзе гаворыцца, што Зарэмбюк — бэнээфавец, "Зубр" і так далей. Як сцвярджаюць некаторыя дасведчаныя людзі, каб надрукаваць такую колькасць улётак, неабходна дастаткова магутная капіравальна-множная тэхніка, а ў раёне яна ёсць не ўсюды.

Алесь Зарэмбюк звярнуўся з заявай у раённую выбарчую камісію. Частка піараўскіх улётак была ліквідавана міліцыяй.

Язэп ПАЛУБЯТКА

УТОЧНЕНИЕ

В "Газеце Слонімскай" от 13 февраля 2003 года в №7 опубликована статья "Галактика" работает с размахом", где указано, что на данном предприятии выявлена недостача в несколько миллионов рублей.

Однако, как считает правление Мостовского райпотребобщества, эта информация недостоверна. В магазине "Галактика" с момента его открытия после ремонта проведено три инвентаризации: 16 декабря 2002 года, 21 января 2003 года, 20 февраля 2003 года, где устанавливались недостачи в пределах 200-300 тыс. руб.

ХОРОШАЯ НОВОСТЬ

СКИДЕЛЬ ДОГОНИТ ЯПОНИЮ?

■ Светлана КУХАРЕВА, БДГ

В скидельском производственном цехе Гродненского завода медпрепаратов введено в эксплуатацию таблеточное производство на основе высокоочищенных аминокислот.



Белорусские лекарства — на мировой рынок

В связи с этим регион официально объявлен центром лечения больных, остро нуждающихся в так называемых препаратах ВАК.

Важность производства высокоочищенных аминокислот (ВАК) как стратегически важного сырья для производства лекарств была осознана ещё в 1970-1980-е годы. Тогда в СССР выполнялась комплексная программа, в которой участвовали НИИ и промышленные предприятия целого ряда союзных республик. Правда, совместными усилиями была выпущена единственная аминокислота L-лизин. Чтобы достичь мировых стандартов качества, на её доработку понадобилось целых 15 лет.

Впервые кристаллы ВАК появились в Японии, которая в настоящее время достигла вершин в подобном производстве. Там выпускается 20 видов высокоочищенных аминокислот. На втором месте стоят США, где разработано более 15 видов ВАК. Следующая и последняя страна в мире, где производят аминокислоты L, — это Беларусь. В настоящее время у нас имеется три вида кристаллов ВАК. Это — L-лейцин, L-валин и L-изолейцин. Следует отметить, что они появились и достигли мирового уровня качества всего за 2 года. На основании L-лейцина вот уже год как выпускаются таблетки под названием «лицин». Ещё неделю назад их производили на основании скидельской аминокислоты только в Борисове. Теперь выпуск таблеток освоен на месте производства ВАК, что приносит определённую экономию. На совместной основе всех трёх производимых аминокислот предполагается наладить в Скиделе капсульное производство лекарства «тавамин».

Учёными разных стран доказано, что лекарства на основе ВАК приостанавливают развитие злокачественных опухолей. Но всё-таки основная их ценность — весьма положительное действие на укрепление имунной системы.

Лекарства и пищевые добавки на основе высокоочищенных аминокислот мировое сообщество учёных считает медициной третьего тысячелетия. С ВАК связывают успешную борьбу с раком и СПИДом. По мнению представителей завода, в связи с тем, что подобное производство отсутствует в странах бывшего Советского Союза и Европы в целом, наша республика при хорошем стечении обстоятельств может получить уникальную возможность для дальнейшего усиленного производства и реализации одной из наиболее современных групп субстанций, на базе которых имеется реальная возможность выхода на внешний рынок. ■

МАСТЫ

ПАРУШАЮЦЬ НЕ ПА СВАЁЙ ВОЛІ

■ Язэп ПАЛУБЯТКА

У двары дома 78, што па вуліцы Савецкай у Мастах, аўтамашына з надпісам "Мастырайгаз" з'явілася 20 лютага.

Яшчэ загадзя ў пад'ездах дома была вывешана аб'ява, што ў гэты дзень будзе праведзены планавы абслед газавых сетак дома, які, як потым патлумачыў начальнік арганізацыі Анатоль Васюк, праводзіцца раз у пяць гадоў. Работнікі "Мастырайгаза" на чале са старшым майстрам Валянцінай Валковіч, маючы адпаведны нарад на правядзенне работ, распачалі выразку ў кватэрах водanагравальных прыбораў (калонак), якія гаспадары ўсталявілі, не маючы на тое пэўных тэхнічных умоў. Аднак у дзве кватэры іх не пусцілі, а кватэраздымшчык трэцяй Юрый К. не дазволіў дэманціраваць калонку, матывуючы тым, што да дома не падведзена гарачая вады, і звярнуўся са скаргаю ў аблвыканкам.

Мясцовыя ўлады, не зацікаўленыя ў скандале напярэдадні выбараў, загадалі кіраўніцтву "Мастырайгаза" часова прыпыніць планавыя работы.

А гісторыя гэта распачалася амаль 20 гадоў назад. У 1984 г. праводзіўся капітальны рамонт дамоў 74, 76, 78 па вуліцы Савецкай. Печы былі заменены на цэнтральнае ацяпленне. У першыя два дамы гарачую ваду падвялі. А дом 78 да гарачага водазабеспячэння не падключалі. Як цяпер сцвярджаюць спецыялісты, адбылося гэта з-за недастатковай магутнасці абагравальнай сістэмы. Так яно ці не так было дваццаць гадоў назад, сказаць цяпер цяжка, бо сённяшняе кіраўніцтва горада пры любым выпадку падкрэслівае, што за дзеянні мінулых кіраўнікоў адказнасці не нясе. А каб падаць у дом цёплую ваду, неабходна пракласці трохі менш трыццаці метраў трубы. Людзі, якія засталіся без гарачай вады, пачалі ставіць газавыя калонкі. Паколькі праблемы з забеспячэннем гарачай вадою ў той час назіраліся пастаянна, то калонкі сталі звычайнай з'явай. Хаця для устаноўкі неабходны адпаведныя тэхнічныя ўмовы, але іх устанаўлівалі без усялякага ўзгаднення. У доме 78, згодна тэхумоў, водanагравальныя калонкі ставіць нельга, але неабходнасць прымусіла людзей устанавіць іх у кожнай кватэры. Гаргаз перыядычна праводзіў абследаванне сваёй гаспадаркі і перыядычна адключаў калонкі ў гэтым доме. Ва ўпраўленні газавай гаспадаркі раёна мне паказалі спіс на болей як 180 кватэраў, дзе незаконна ўстаноўлены гэтыя прыборы. Сярод тых, хто зрабіў гэта, нават некаторыя кіраўнікі арганізацый раёна. Таму змагацца з гэтым раней было цяжка. Бывалі выпадкі, калі другі сакратар райкама партыі асабіста казаў, каму трэба адключаць калонку, каму не. Напачатку пры адключэнні ставілі так званыя "згоны" і пламбіравалі. Аднак, як толькі газавікі сыходзілі, гаспадары зрывалі пломбы і падключалі калонку. Ні адзін з пададзеных на адміністацыйную камісію актаў не быў разгледжаны, і ніхто з самавольнікаў не панёс пакарання.

У 2003 годзе "Мастырайгаз" зноў намеціў навесці парадак у сваёй гаспадарцы. У сувязі з гэтым у снежні мінулага года кіраўніцтва прадпрыемства з адпаведным лістом звярнулася ў райвыканкам. Старшыня выканкама Аляксандр Кісялёў уласнаручна наклаў рэзалюцыю, каб усё было зроблена адпаведна нарматываў. Такім чынам, ураз жыхары дома 78 па вуліцы Савецкай пазбаўляліся магчымасці зімой мець гарачую ваду.

Імкненне газавікоў прывесці сваю гаспадарку да пэўных нарматыўных умоў — слушныя і законныя. Невыкананне правілаў эксплуатацыі награвальных калонак можа прывесці да непапраўнай бяды. Але як быць людзям, якія сярод зімы застануцца без гарачай вады? Хто абароніць іх інтарэсы?

У тэлефоннай размове намеснік старшыні райвыканкама Генадзь Снітко сказаў карэспандэнту "ГС", што летам дом будзе падключаны да сістэмы гарачага водазабеспячэння. Хочацца верыць, што словы Генадзя Пятровіча не разыдуцца са справай. ■

НОВОСТИ

КРЕСТЬЯНЕ НЕ В СОСТОЯНИИ ДЕРЖАТЬ СКОТИНУ

В личных подсобных хозяйствах Беларуси сокращается численность поголовья скота.

Так, по данным Министерства статистики и анализа, в целом за 2002 год в частном секторе количество коров снизилось на 51,8 тысячи голов, что составляет 9,2 процента от общей численности. В личных подворьях стали меньше держать свиней. Их количество сократилось на 107 тысяч голов (8,7 процента).

Свыше чем на 13 и 4 процента соответственно уменьшилось количество овец и коз. Причинами снижения численности животных являются как сложная экономическая ситуация на селе, так и демографическая.

ХАРТИЯ-97

ДОЛЖНИКАМ ОТКЛЮЧАТ ТЕЛЕФОН

Для обеспечения расчетов за услуги электрической связи Совет Министров Беларусь постановил (ПСМ РБ №215 от 20.02.2003г.), что органы госуправления под персональную ответственность их руководителей должны обеспечить 100-процентную уплату текущих платежей за услуги электросвязи и погашения до 31 марта образовавшейся на 31 декабря 2002 г. задолженности за эти услуги.

Руководителям организаций при заключении договоров о предоставлении услуг электрической связи рекомендовано рассчитываться за эти услуги посредством платежных требований с оплатой услуг в день поступления их в банк плательщика.

Минсвязи должно в 3-месячный срок внести в Совет Министров предложения о порядке ограничения пользования услугами связи для организаций, не обеспечивших своевременную их оплату.

ХАРТИЯ-97

СТАТИСТИКА

ВЫМИРАЮЩАЯ ДЕРЕВНЯ

С 1993 года происходит абсолютное уменьшение численности населения страны.

Нас уже осталось менее 10 млн. человек. По количеству населения мы опустились до уровня 1985 года.

В селе проживает 30,6 процента, или 2,9 млн. человек. Доля детей в общей численности населения в целом по республике снизилась до 17,5 процента. Будущих работников сельского хозяйства растет только около 500 тысяч человек.

Надежд на улучшение положения нет. Смертность среди населения постоянно растет и в 2001 году уже достигла 14,2 человека на 1000 жителей. Причем умирают люди далеко не пенсионного возраста, многие – в 45–49 лет.

«Народная воля»

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017


© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

НОВОГРУДОК

"ПОГОНЯ" – СИМВОЛ ГОСУДАРСТВЕННОСТИ



Герб "Погоня" будет символом празднования 750-летия коронации Миндовга в Новогрудке. Такое решение принято 27 февраля на заседании национального общественного оргкомитета, созданного специально для празднования этого события, состоявшегося в Новогрудке 6 июля 1253 года.



Друзья рыцарского клуба "Цель" на Замковой горе в Новогрудке

Фота Віталя ГІЛЯ

В обсуждении вопроса о государственном символе Литовско-белорусского государства в середине 13-го века приняли участие известные деятели национальной науки и культуры.

Так, по словам председателя оргкомитета, доктора истории, профессора Белорусского государственного университета культуры Анатоля Грицкевича, еще Вацлав Ластовский в своей "Гісторыі крыўскай кнігі" говорил о "Погоне" как о древнем гербе полоцких князей, ссылаясь на "Сказание о Меркурии Смоленском".

Как отметил литературоведлатинист Алесь Жлутко, в фондах Новогрудского краеведческого музея хранится латиноязычное историческое исследование 17-го века, посвященное первой столице ВКЛ. В этом труде, написанном по приказу новогрудского воеводы ученымиезуитом, приводится утверждение о том, что герб "Погоню" придумал Миндовг.

Художник Микола Купава полагает, что "если великий князь короновался на королевский титул, государство уже должно было иметь свой символ". Художник напомнил, что идея герба "Погони" как государственного символа Литовско-белорусского государства в середине 13-го столетия была обоснована в трудах известного отечественного историка-медиевиста Миколы Ермоловича и признана белорусской общественностью еще более 30 лет назад. Кроме того, как отметил художник, в произведениях ряда белорусских литераторов, в том числе Генриха Далидовича, Ольги Ипатовой и Кастуся Тарасова, этот символ средневековой Беларуси ассоциируется с личностью Миндовга.

На заседании оргкомитета также был утвержден текст обращения оргкомитета в связи с юбилеем коронации Миндовга.

Герб "Погоня" был государственным символом Республики Беларусь в 1991–1995 годах. После референдума в мае 1995 года его сменил слегка видоизмененный герб бывшей БССР.

БелаПАН

ЛИДА

КОНФИСКОВАЛИ ЗА КОНТРАБАНДУ

На пункте пропуска "Козловичи" таможни "Западный Буг" во время досмотра автомобиля "Скания", следовавшего из Беларуси в Польшу, сотрудники Брестской погрангруппы обнаружили тайник, в котором были спрятаны 82 тысячи пачек импортных сигарет.

Как сообщил БелаПАН старший офицер пресс-службы Брестской погрангруппы Дмитрий Девятов, тайник был оборудован в полуприцепе. Сигареты изъяты. Задержан и автомобиль, принадлежащий индивидуальному предпринимателю из Лиды. По предварительным оценкам, общая стоимость задержанного составляет около 100 миллионов рублей.

Валентина КОЗЛОВИЧ

ВОЛКОВЫСК

ЭКСКУРСИЯ НА ЗАСТАВУ

Воспитанники Волковыского военно-спортивного клуба «Школа выживания» совершили экскурсию на пограничную заставу имени Усова.

Ребята познакомились со службой и бытом пограничников, осмотрели оружие и боевую технику, побывали в питомнике для служебных собак, ознакомились с устройством инженерно-заградительных сооружений, контрольно-следовой полосой. Ребята узнали о героической обороне пограничников в первые часы нападения гитлеровских захватчиков в начале второй мировой войны.

НОВАЯ ВЫСТАВКА

В районном центре ремёсел открылась новая выставка "Агеньчыкі спадчыны", которая состоит целиком из работ участников центра.

Это своеобразный отчёт о проделанной за минувший год работе, о том, чему научились юные мастера. Каждый из них представил на выставку свои новые работы. Теперь увидеть и оценить их смогут все желающие.

ГОРЯТ ДАЧИ

В течение последней недели подразделения Волковыского РОЧС дважды выезжали на тушение пожаров, произошедших в дачном массиве "Козьи горы".

Из-за отдалённости от райцентра и несвоевременного сообщения деревянные конструкции дачных домиков полностью уничтожены огнём.

ВИНОВАТ ЛИ МУЖ?

В своей квартире в деревне Долгополь Волковыского района был обнаружен труп гражданки З.

Судебно-медицинская экспертиза установила, что смерть наступила в результате тяжких телесных повреждений. В совершении преступления подозревается муж погибшей.

Александр ДАНИЛИН

СЛОНІМ

ГРЫП УЖО Ў СЛОНІМЕ

На сённяшні дзень на Слонімшчыне захварэла на грып 266 чалавек.

Пра гэта карэспандэнту "ГС" паведаміла загадчыца эпідэміялагічнага аддзела Слонімскага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Алена Дабрыян.

Алена Ігараўна адзначыла, што на грып захварэлі людзі самых розных узростаў: ад дзяцей да пенсіянераў. Хаця пік захворвання ў Слоніме не наступіў і разнавіднасць яго, у параўнанні з мінулымі гадамі, не змянілася, эпідэмія наш горад можа мінаваць. Праўда, да сярэдзіны сакавіка колькасць хворых магчыма яшчэ павялічыцца. Таму ў перыяд грыпу неабходна прымяняць розныя антывірусныя прэпараты. Найперш, аксалінавай маззю змазваць насавыя ходы, перад тым, як выйсці на вуліцу. Піць для прафілактыкі розныя вітаміны, рэмантадзін і іншыя медыкаменты. Усе яны ў нашых аптэках ёсць. І, вядома, неабходна часцей бываць на свежым паветры, праветрываць памяшканні, пазбягаць пераахалоджванняў, – параіла Алена Дабрыян.

Сяргей ЧЫГРЫН

БАРАНОВИЧИ

ОБНАРУЖЕНО 150 ЯЩИКОВ С ВОЕННЫМ ИМУЩЕСТВОМ

150 ящиков с военным имуществом, похищенным со склада одной из дислоцирующихся в Брестской области воинских частей, обнаружили в ходе оперативно-розыскных мероприятий сотрудники Барановичского горотдела управления КГБ по Брестской области.

Ящики с танковыми радиаторами, гусеничными катками, запчастями к бронетехнике, шлемофонами находились на складе унитарного предприятия "Экспериментальная база "Вольно" в Барановичском районе.

Как сообщили БелаПАН в пресс-группе УКГБ, запчасти в феврале были вывезены со склада в/ч 21553 на автомобилях "Урал" и "КамАЗ", которые следовали в Минск.

Барановичская межгарнизонная прокуратура на днях возбудила уголовное дело по части 2 статьи 211 Уголовного кодекса Беларуси (присвоение либо растрата) в отношении прапорщика вышеназванной воинской части К., который проходит как основной подозреваемый. Он уже написал заявление о явке с повинной. В настоящее время устанавливается круг должностных лиц, которые давали указания прапорщику перевезти имущество на склад в Барановичский район.

БелаПАН

МАСТЫ

ЗНОЎ МЯНЯЮЦЬ НАЗВЫ КАЛГАСАЎ

У Мастоўскім раёне распачалося пераіменаванне калгасаў.

Звязана гэта з тым, што апошнім часам у рэспубліцы калгасы сталі ператвараць у сельгаскааператывы. У сувязі з гэтым сталі мяняцца і іх назвы. Калгас імя Карбышава стаў закрытым акцыянерным таварыствам, але з назваю пакуль не вызначыліся. Змена статусаў гаспадарак і адпаведна назваў павінна закончыцца да 1 ліпеня. Якую суму давядзецца заплаціць за новую пячатку і іншыя мерапрыемствы, звязаныя са зменай статуса і назвай, ніхто яшчэ не падлічыў.

Язэп ПАЛУБЯТКА

БАРАНОВИЧИ

ОСУЖДЕННЫЙ ЖУРНАЛИСТ ИЗБРАН ПРЕДСЕДАТЕЛЕМ

Редактор газеты "Рабочы" Виктор Ивашкевич, отбывающий наказание в исправительном учреждении открытого типа при Барановичским РУВД, общим голосованием осужденных избран председателем самоуправления (совета) этого учреждения.

В сентябре 2002 года журналист был осужден к двум годам лишения свободы за покушение на клевету и публичное оскорбление президента.

Как сообщил в интервью БелаПАН В.Ивашкевич большинство из 150-ти голосовавших решили, что именно он сможет поднять актуальные социальные проблемы этого учреждения. Несмотря на то, что, по словам В.Ивашкевича, "самоуправление здесь имеет столько же полномочий по сравнению с администрацией учреждения, сколько местные Советы по сравнению с президентской "вертикалью", в своем новом статусе журналист намерен обязательно проводить политинформации для осужденных.

Алексей ШЕИН

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

Любимых и очень дорогих бабушек и мам
Раису Якимовну ЛАГУТИК
и Лидию Александровну КИСЕЛЁВУ
поздравляем с праздником Весны!




Мы желаем счастья море,
Чтобы вы не знали горя!
Никогда вы не болели, долго-долго не старели!
Чтобы в жизни вашей личной
Всё всегда было отлично!

С любовью и теплотой внук Роман, сын и зять Валерий

Дорогих и уважаемых женщин детского сада № 16 поздравляем с днём 8 Марта!

Среди весенних первых дней
8 Марта всех дороже.
На всей земле, для всех людей
Весна и женщины похожи.
Успехов вам, здоровья вам
И счастья пожелаем,
И с первым праздником весны
Сердечно поздравляем.

С уважением коллектив мужчин детского сада № 16

Дарагую і любімую бабулю
Марыю Іванаўну ЛАГУЦІК
віншуем з Міжнародным жаночым днём 8 Сакавіка!



Жыць Вам сто гадоў жадаем,
помнім, любім, даражым!
Хай бяда Вас мінае, будзьце
шчаслівы ва ўсім!


З любоўю ўнукі Раман, Цімур, Руслан

Дорогой и любимой
Александр Владимирович БОРИСЕВИЧ!
От всего сердца поздравляем тебя с днём рождения!

Тебе сегодня — двадцать лет!
В свой юбилей прими привет
От всех, кто входит в светлый круг:
Родных людей, друзей, подруг!
От наших всех сердец прими
Признание в большой любви.
И пусть горит ещё сто лет
Тебе дней этих звёздный свет!!!

С любовью жена Оля, мама, папа, брат Володя с женой Инной, тесть, тёща

Дорогая, любимая мамочка
Мария Алексеевна ДЕМЕНТЬЕВА!
Горячо и сердечно поздравляем тебя с 45-летием!



Ты, как всегда, полна забот,
Ведь жизнь давалась нелегко.
Ах, сколько трудных, тяжких дней
По сердцу твоему прошло.
Ты заслужила в жизни радость
На много дней уже вперёд.
Так будь же счастлива, здорова
И каждый день, и каждый год.
Не грусти, что волосы седеют,
Береги себя и не болей,
Потому что нет на белом свете
Человека ближе и родней.

С любовью дочери Ольга и Наталья

Дорогая, любимая наша именинница
Мария Александровна ОНУФРОВИЧ!
От всего сердца поздравляем тебя с 50-летием!



У тебя сегодня юбилей!
И мы от всей души желаем
Прожить тебе много-много лет,
Печали, горести не зная.
Пусть не пугают тебя года —
Ещё их сколько в жизни будет.
Пусть будут в спутниках всегда
Доброжелательные люди.
Пусть ангел твою жизнь хранит,
Пусть в жизни всякое бывает,
Пусть горе в двери не звонит,
А радость пусть не забывает!

С любовью дядя Иван, тётя Надя

Любимая наша дочь и жена, мамочка и бабушка
Светлана Анатольевна МАРЧИК!
Горячо и сердечно поздравляем тебя с юбилеем!

Любимая, хорошая, родная,
Тебя дороже в этой жизни нет.
Ты лучшая на свете мама,
Тебе желаем мы прожить сто лет.
Целуем твои руки, дорогая,
Морщинки и седую прядь волос,
И низко просим у тебя прощенья
За боль и грусть, что каждый преподнёс.
Тебе многое в жизни пришлось пережить,
И горестей было немало,
Но нас ты сумела растить и любить,
Родная, любимая мама.
Живи подольше, человек любимый,
И главное, конечно, — не болей!
Поверь, что ты нужна на свете
Для всей родни и нас — детей!



С уважением и любовью муж Виктор, дочери Ольга и Наташа, зять Сергей, мама и свекровь

Дорогой, любимый муж, папочка и дедушка
Владимир Михайлович ЛЫСЕНЯ!
От всего сердца поздравляем тебя с юбилеем, с 50-летием!



Желаем счастья и улыбок,
Здоровья, бодрости, друзей,
Поменьше совершать ошибок,
Ценить доверие родных
И близких тебе людей.
Очень любим мы тебя
И ценим как отца и мужа,
И в день рождения, любя,
Мы говорим, что ты нам нужен.

С любовью жена, дети и внуки

Дорогая, любимая подружка
Катерина ЧЕМЕРЕВСКАЯ!
Горячо и сердечно поздравляем тебя с днём рождения и праздником Весны!



Только тебе и могу я
Тайны поведать мои,
И не хотела б другую
Выбрать в подруги свои!
Здоровья тебе, дорогая!
Удач и успехов в судьбе!
Любви безоглядной желаю
И счастья большого тебе!

С любовью подруга Жанна с семьёй

Уважаемая, дорогая
Клавдия Ивановна БАРТОШ!
Искренне поздравляем тебя с юбилеем!

Крепкого тебе здоровья, счастья и долгих лет жизни.




Юбилей — чудесный праздник,
Всей семьёй спешим сказать:
«Пусть будет жизнь твоя прекрасной,
В семье погода — только ясной,
Пусть льются нежных слов потоки,
Не режут слух слова-упрёки,
И беды будут нипочём».
Сказать «спасибо» — это мало,
Мы все в долгу перед тобой.
Дай Бог тебе здоровья —
Желанье всей родни твоей.
И в этот день мы кланяемся низко
За душу добрую тебе.
До старости глубокой и счастливой
Ты доживи и правнуков дождись,
